*Л. У. Ляховіч, кандыдат гістарычных навук,*
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*культуры і мастацтваў*

# РАСІЙСКАЯ МАНАРХІЯ І ЯЕ ДУХОЎНЫЯ АСНОВЫ: ГІСТАРЫЯГРАФІЧНЫЯ ТРАНСФАРМАЦЫІ ХХ – ПАЧАТКУ ХХІ ст.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У сувязі з масштабнымі сацыякультурнымі зменамі апошніх дзесяцігоддзяў у гуманітарных навуках постсавецкай прасторы з’явіліся новыя прыярытэты. У прыватнасці, у расійскай гістарыяграфіі на хвалі расчаравання рэвалюцыямі і сацыяльнымі эксперыментамі, абсалютызацыяй ролі мас у гісторыі і класавай барацьбы цэнтральнае месца заняла праблема ўлады. Пры гэтым па шэрагу прычын менавіта манархічная форма ўлады выклікае максімальную цікавасць, а ў сувязі з узрастаннем ролі рэлігіі – сакральны складнік манархіі.

Абгрунтаванне сакральнасці, дадзенасці Богам манархічнай улады было ўніверсальнай з’явай, і прыклад расійскай манархіі з’яўляецца спецыфічнай ілюстрацыяй гэтага правіла. Хрышчэнне Русі і ўплыў візантыйскай традыцыі на разуменне манархічнай улады, «сімфонія» адносін свецкай і духоўнай улад, тэзіс «Масква – Трэці Рым», тэорыя «афіцыйнай народнасці», славянафільства і візантызм – гэта праблемы, якія ўжо даўно сталі «агульным месцам» у гістарыяграфіі. У дадзенай публікацыі зроблены акцэнт на іншым – вяртанні, праўда, у змененым выглядзе манархічнай ідэі і яе духоўнага складніка ў нашы дні.

На мяжы ХІХ–ХХ стст. яскрава выявілася некалькі плыняў у расійскай грамадскай думцы, якія з розных ідэйна-палітычных пазіцый трактавалі феномен расійскай дзяржаўнасці. Гэты ідэйна-палітычны спектр быў разнастайны – сацыял-дэмакраты, лібералы рознай ступені радыкальнасці, нарэшце манархісты, моцнай падтрымкай якіх былі руская рэлігійная філасофія пачатку ХХ ст. і візантыйства. Сярод знакавых фігур расійскай манархічнай ідэі таго часу – К. М. Лявонцьеў (1831–1891), Л. А. Ціхаміраў (1852–1893), У. С. Салаўёў (1853–1900), М. І. Чарняеў (1853–1910).

Разам з Ф. М. Дастаеўскім К. М. Лявонцьеў упершыню выкарыстоўвае паняцце «еўразійства», гаворачы аб Расіі як аб асобным самадзяржаўным, закрытым, але дынамічным свеце. Згодна з Лявонцьевым, уплыў Захаду на Усход быў заўсёды павярхоўным,

між тым як Усходу на Захад – трывалым і глыбокім.

Л. А. Ціхаміраў, гаворачы аб формах манархічнай улады, адрознівае абсалютызм еўрапейскай манархіі, самаўладдзе Усходу і расійскае самадзяржаўе [8, с. 72–73]. Пры гэтым еўрапейскі абсалютызм – гэта абсалютная ўлада дзяржавы над масай; на Усходзе назіраецца велізарная залежнасць царавання ад асобы правіцеля, гэта свайго кшталту ўзурпацыя [9, с. 123–131]. У Расіі ж манархічная ўлада самадзяржаўная, заснаваная на маральным адзінстве манарха і народа, і, «падпарадкоўваючы сваё жыццё маральнаму ідэалу, нацыя, уласна, жадае падпарадкаваць сябе Боскаму кіраўніцтву» [9, с. 81, 139]. Для Ціхамірава «светлы ідэал, які насіўся над краінай у выглядзе самадзержца, з'явіўся разам з праваслаўем» [9, с. 87]. Царская ўлада – адзіная і неабмежаваная, але цар – ад Бога прыстаў і кіруе як прадстаўнік не народнай, а Боскай улады [9, с. 89, 96–101].

Для У. С. Салаўёва дзяржава – гэта апірышча чалавечай супольнасці, абарона ад ціску стыхійных як знешніх, так і ўнутраных сіл. Аднак, каб неператварыцца ў Левіяфана, дзяржава павінна падпарадкаваць сябе рэлігійнаму пачатку, што атрымае ўвасабленне ў гарманічным спалучэнні духоўнай і свецкай улад, у асобнай форме служэння Боскай воле [6].

З пункту гледжання М.І. Чарняева, «самадзяржаўе патрэбна разумець, яле ў яго патрэбна і верыць», таму што ахапіць яго адным розумам немагчыма [10, с. 16]. «Містыка рускага самадзяржаўя, – сцвярджае Чарняеў, – цалкам выцякае з вучэння Праваслаўнай царквы аб уладзе і з народных поглядаў на цара як на "Божага прystава". Рускі манархізм, як народнае пачуццё і народны інстынкт, карэняцца ў той глыбокай і патаемнай сферы бессвядомага, якое дае пачатак і апору ўсім праявам чалавечага духу…» [10, с. 16]. Расіі, якая прыйшла да самадзяржаўя заканамерна, пад уплывам геаграфічных, этнаграфічных, гістарычных і культурных умоў, не патрэбна заходнееўрапейскае народнае прадстаўніцтва, таму што ў яе ёсць сваё, роднае і зразумелае прадстаўніцтва – рускі цар…[10, с. 28, 77].

Савецкая гістарыяграфія, зразумела, адкінула як манархічную ідэю, так і ідэю сакральнасці царскай улады. Дзяржава разглядалася як апарат класавага панавання, а царызм, які ідэалагічна абапіраўся на вучэнне Праваслаўнай царквы, – як «непазбежнае зло», якое ў рэшце рэшт было звергнута Лютаўскай рэвалюцыяй. З крушэннем марксісцкай метадалогіі гістарычнай навукі, на фоне палітычных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

спрэчак у грамадстве адбылося ажыўленне манархічнай ідэі, у тым ліку яе духоўна-рэлігійнага складніку, і ў гэтым сэнсе выглядае знакавай публікацыя прац І. Л. Саланевіча (1891–1953) [8]. Зразумела, што не змаглі пазбегнуць ідэйнага падзелу і расійскія гісторыкі. У прыватнасці, гэта добра бачна пры аналізе ацэнак кіравання Мікалая ІІ і выствятленні перадумоў падзення расійскай манархіі. Была запатрабаваная і праявілася гістарыяграфічная рэфлексія створанага ў гэтым кірунку [4; 7].

Сярод сучасных расійскіх гісторыкаў, якія прытрымліваюцца манархічнага падыходу, у рамках дадзенай публікацыі звернем увагу на працы А. М. Баханава (н. у 1944 г.). З яго пункту гледжання, ліберальная мадэль Захаду для Расіі была бесперспектыўная, і, як кіраваць, каб вырашыць наспелыя праблемы, не ведаў ніхто [2, с. 10]. Падзенне манархіі адначасова азначала і духоўную гібель Расіі. «Асаблівасцю рускага грамадска-палітычнага ладу, – адзначае Баханаў, – было тое, што ў народнай свядомасці і народнай веры непасрэдна была ўмацаваная толькі сама вярхоўная ўлада – улада цара, усё ж астатняе… трымалася толькі ўскосна, сілай царскай улады, і не мела непасрэдных каранёў у народнай свядомасці… Усе аказаліся вінаватымі і ўсе аказаліся ахвярамі… У гэтай трагічнай узаемасувязі быў рок Расіі, яе вялікая асуджанасць» [3, с. 383–384].

На хвалі псіхалагічнай ломкі, расчараванняў і духоўных пошукаў вяртанне постсавецкага грамадства да ідэі манархічнай дзяржаўнасці, заснаванай на рэлігійным фундаменце, паўстае як пэўны сімптом грамадскіх настрояў. Больш таго, дадзеная з’ява стала прадметам навуковага аналізу, гэтаксама як і пераасэнсаванне дарэвалюцыйнай манархічнай традыцыі [1; 5]. Нягледзячы на наяўнасць неаманархізму як пэўнай сілы ў расійскім ідэйна-палітычным спектры [1, с 37], усе ж канстатуецца, што ў сучаснай Расіі «адсутнічаюць сацыяльныя, рэлігійныя і псіхалагічныя асновы, якія дазваляюць разлічваць на аднаўленне манархічнай дзяржаўнасці» [5, с.17].

1. *Асонов, Н. В.* Политические доктрины российского самодержавия: генезис, эволюция и современный дискурс : автореф. дис. … д-ра полит. наук : 23. 00. 01 / Н. В. Асонов; Рос. акад. гос. службы при Президенте РФ. – М., 2009. – 42 с.

2. *Боханов, А. Н.* Сумерки монархии / А. Н. Боханов. – М. : Воскресенье, 1993. – 394 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

3. *Боханов, А. Н.* Николай II / А. Н. Боханов // Российские самодержцы, 1801–1917 / А. Н. Боханов [и др.] ; отв. ред. А. А. Корелин. – 2-е изд. – М. : Междунар. отношения, 1994. – С. 307–384.

4. *Горбунова, Ю. Ф.* Император Николай II как государственный деятель в отечественной историографии (конец XIX – начало XXI в.) : автореф. дис. … канд. ист. наук : 07. 00. 09. / Ю. Ф. Горбунова; Томск. гос. ун-т. – Томск, 2004. – 26 с.

5. *Гусев, И. В.* Монархическое направление русской социально-политической мысли XIX–XX веков: автореф. дис. … канд. филос. наук : 09.00.03. / И. В. Гусев ; Твер. гос. ун-т. – Тверь, 2005. – 19 с.

6. *Соловьев, В. С.* Оправдание добра / В. С. Соловьев ; Институт рус. цивилизации. – М. : Алгоритм, 2012. – 656 с.

7. *Соколов, Н. П.* Николай II в отечественной литературе эпохи «перестройки» / Н. П. Соколов // Россия в Новое время : выбор пути исторического развития : материалы межвуз. науч. конф., 22–23 апр.1994 г. – М. : РГГУ, 1994. – 129 с.

8. *Солоневич, И. Л.* Народная монархия / И. Л. Солоневич. – М. : Эксмо : Алгоритм-книга, 2003. – 606 с.

9. *Тихомиров, Л. А.* Единоличная власть как принцип государственного строения / Л. А. Тихомиров. – М. : Трим, 1993. – 192 с.

10. *Черняев, Н. И.* Мистика, идеалы и поэзия русского самодержавия / Н. И. Черняев. – М. : Москва, 1998. – 432 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ